«ЗВЯЗДА» — ПАДПОЛЬШЧЫЦА І ПАРТЫЗАНКА 4-5

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 МАЯ 2023 г. СЕРАДА № 87 (29967)

ПАКУЛЬ ГАРЫЦЬ ВЕЧНЫ АГОНЬ — МЫ БУДЗЕМ ПАМЯТАЦЬ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 Мая ўзяў удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах у гонар Дня Перамогі

Фота БелТА.

Па традыцыі Прэзідэнт усклаў вянок да манумента Перамогі ў Мінску. Разам з Аляксандрам Лукашэнкам былі яго трое сыноў. Для Прэзідэнта гэта штогадовая традыцыя — асабіста браць удзел у цырымоніі ўскладання.
Да помніка таксама леглі вянкі і кветкі ад кіраўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, Нацыянальнага сходу, судовага корпуса, сілавых структур, грамадскіх аб'яднанняў, дыпламатычнага корпуса, ветэранаў і духавенства.

А перад гэтым кіраўнік дзяржавы на Краснай плошчы ў Маскве прысутнічаў на параднае ў гонар 78-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Разам з іншымі лідарамі краін СНД і ветэранамі, якія прыбылі ў Маскву, Аляксандр Лукашэнка назіраў за парадам з трыбуны. Пасля завяршэння парада лідары краін разам усклалі вянок і кветкі да Магілы Невядомага Салдата ў Аляксандраўскім садзе каля сцен Крамля.

У час урачыстай цырымоніі на плошчы Перамогі па даручэнні кіраўніка дзяржавы, Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, міністр абароны Віктар Хрэнін выказаў пазіцыю людзей у пагонах аб значэнні Вялікай Перамогі і ахарактарызаваў ваенна-палітычную абстаноўку вакол Беларусі.

«Сёння дзень Вялікай Перамогі вялікага савецкага народа. Кожны год мы прыходзім на гэтае святое месца — да велічнага манумента, увянчанага ордэнам Перамогі. Гэты сімвал гістарычнай памяці ўзвышаецца над горадам-героем Мінскам, нагадваючы аб подзвігу, падобнага якому не ведае гісторыя чалавецтва, які сёння аб'ядноўвае мільёны людзей Еўропы і Азіі — усіх, хто захаваў у сабе ген доблесці і мужнасці продкаў», — адзначыў міністр.

Ён падкрэсліў, што беларусы ганарацца кожным сваім воінам — ад простага салдата да генерала, якія разам з брацкімі народамі вытрымалі ўдар гітлераўскай Германіі, разбілі войска, мабілізаванае з усёй Заходняй Еўропы і ўзброенае да зубоў на грошы сусветных магнатаў.

«Мы ганарымся нашымі партызанамі, падпольшчыкамі і разведчыкамі, якія набліжалі пераможны май у тыле ворага, не баючыся шыбеніц і катаванняў, не шкадуючы свайго жыцця. Мы ганарымся маці, якія праводзілі мужоў і сыноў на фронт, пад страхам смерці выпякалі хлеб для партызан, яўрэяў і параненых байцоў Чырвонай Арміі, а малых закрывалі сваімі целамі ад куль і бомбаў. Наша сэрца да гэтага часу гарыць агнём Хатыні і соцень беларускіх вёсак, спаленых разам з бездапаможнымі старымі, жанчынамі і дзецьмі. Мы схіляем галовы перад памяццю нашых братоў з усіх куткоў Савецкага Саюза, якія вызвалілі Беларусь і назаўжды засталіся ляжаць у нашай зямлі», — заявіў Віктар Хрэнін.

Міністр зазначыў, што сёння людзі ішлі да гэтага манумента ўвесь дзень. Па закліку сэрца. Ішлі сем'ямі, з дзецьмі, унукамі. «Плошча Перамогі традыцыйна патанае ў кветках. Гэта самае малое, што мы можам зрабіць сёння, аддаючы доўг героям, якія выратавалі родны народ, спынілі генацыд і ачысцілі Еўропу ад фашысцкага рэжыму, які пакінуў самы крывавы след у гісторыі. Аддаючы даніну памяці нявінным ахвярам неймаверных па жорсткасці злачынстваў XX стагоддзя. І пакуль гарыць Вечны агонь — мы будзем памятаць. Мы будзем берагчы праўду аб той вайне», — падкрэсліў Віктар Хрэнін.

«Мы будзем з удзячнасцю ўспамінаць франтавікоў, параненых і спакутаваных, якія вярнуліся і ў рэкордныя тэрміны аднавілі апаленыя агнём гарады і вёскі. Мы будзем заўсёды прытрымлівацца гэтага прыкладу сапраўднага імкнення да міру і стваральнай працы. У гэтым — наша сіла і сэнс гістарычнага шляху беларусаў, якія ўмеюць перамагаць, ствараць і абараняць мір на роднай зямлі», — заявіў міністр.

Міністр звярнуў увагу, што сёння развязана глабальнае ваеннае супрацьстаянне паміж заходняй і ўсходнеславянскай цывілізацыямі. «Схватка разгорнута па ўсіх франтах, ідзе маштабная проксі-вайна, дзе Захад рукамі ўкраінцаў ваюе за свае інтарэсы, за магчымасць і далей усталёўваць у свеце свой парадак. Украіну напампоўваюць зброяй. Суседнія з намі дзяржавы адкрыта гандлююць русафобіяй і гатовы кінуць народ у мясарубку вайны ў другім эшалоне. Мы бачым, як набірае абароты мілітарызацыя Польшчы і Балтыі», — канстатаваў Віктар Хрэнін.

Паводле яго слоў, літаральна днямі стартавалі буйныя шматнацыянальныя вучэнні «Абаронца Еўропы», беспрэцэдэнтныя па колькасці ўдзельнікаў. «Мэты відавочныя. Падобнымі дзеяннямі асобныя заходнія палітыкі толькі штурхаюць планету ў бездань, спрабуюць раздзьмуць на тэрыторыі Еўропы пажар трэцяй сусветнай вайны. Наша армія гатова даць адпор любому, хто паспрабуе парушыць свяшчэнныя рубяжы беларускай дзяржавы. Мы зробім усё, каб ніхто не смеў указваць беларусам, як нам жыць на сваёй зямлі», — падкрэсліў міністр абароны.

«З Днём Перамогі! Міру нам, шчасця і дабра, чыстага неба над роднай Беларуссю», — пажадаў міністр.

ISSN 1990 — 763X

ЗАХОЎВАЮЧЫ ГІСТОРЫЮ, ВЫЗНАЧАЕМ ДАЛЕЙШЫ ШЛЯХ

Беларусы адзначылі 78-ы пераможны май. Святкавалі прыгожа, урачыста, гучна, маштабна — так, як і належыць народу, які ўнёс важкі ўклад у агульную Перамогу, заплаціўшы за сённяшні мірны дзень кожным трэцім сваім жыхаром. Галоўныя ўрачыстасці па традыцыі адбыліся ў эпіцэнтры беларускай сталіцы — на плошчы Перамогі. У цырымоніі ўскладання вянкоў і кветак у памяць аб нашых суайчыннiках, якія не дачакаліся 9 мая 1945 года, узялі ўдзел вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі арганізацый і ведамстваў і, вядома, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.

Да пачатку мерапрыемства каля манумента Перамогі карэспандэнты «Звязды» пагутарылі з удзельнікамі ўрачыстасці. **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** падзялілася, што для яе азначае Дзень Перамогі: «Перш за ўсё шчасце, мір і спакой. Гэта дзень гонару, радасці за тое, што мы жывём у мірнай і спакойнай краіне. Але разам з тым і горыч ёсць у кожнага, бо тое, што прыйшлося перажыць людзям, якія жылі ў той час, страшна нават выхаваннем, — падкрэсліў ён. — Гэта не толькі традыцыйны догляд памятных месцаў, гэта шэсце ў межах праекта «Беларусь памятае!» з партрэтамі родных і блізкіх, работа ў лічбавай прасторы, тыя самыя бутаньеркі, якія сталі нацыянальным брэндам і сімвалам патрыятычнага настрою нашых людзей».

Для Аляксандра Лук'янава Дзень Перамогі — асаблівае свята. «Я ганаруся сваім дзедам, Барысам Рыгоравічам Лук'янавым, які яшчэ ў 1938 годзе быў прызваны Быхаўскім ваенкаматам, служыў і праходзіў фінскую кампанію, прымаў удзел у абароне Магілёва, быў кулямётчыкам, паранены пад Кёнігсбергам, але аднавіўся і працягваў службу да 1946 года на Далёкім Усходзе, — расказаў першы сакратар ЦК БРСМ. — Дзед вярнуўся ў родную вёску і яшчэ доўгі час працаваў на карысць сельскай гаспадаркі. На жаль, я практычна яго не памятаю: ён сышоў з жыцця, калі мне было тры гады. Але па гісторыях родных і блізкіх ведаю, што дзядуля вельмі рэдка дзяліўся гэтымі трагічнымі момантамі».



На ўрачыстасць каля манумента Перамогі разам са сваёй дачкой прыйшоў і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Алег ГАЙДУКЕВІЧ.** Па словах дэпутата, да Дня Перамогі мы сталі ставіцца яшчэ больш сур'ёзна, чым раней. «Мы разумеем, што гэта свята не толькі аб мінулым — аб тым, што трэба памятаць, хоць гэта надзвычай важна, — лічыць парламентарый. — Гэта свята аб будучыні. Сёння мы зноў вядзём барацьбу за права Беларусі быць суверэннай і незалежнай, за права захаваць сваю гісторыю, самім вызначаць свой шлях. У нас хочуць усё гэта забраць, хочуць, каб мы забыліся, што з'яўляемся нашчадкамі герояў-пераможцаў».

І гэта не проста словы: «Мой дзед, Васіль, да 1945 года быў у партызанах, а потым у лясах вёў вайну з бандэраўцамі, — дзяліўся дэпутат. — Мне ніхто казак не раскажа: я ведаю, як бандэраўцы знішчалі нашы вёскі, спальвалі беларусаў, — дзед мне ўсё расказаў. Дзеці нашы нічога гэтага не ведаюць, мы павінны ім данесці ўсю праўду. У Беларусі кожная сям'я — сям'я герояў. Хтосьці працаваў у тыле, хтосьці змагаўся на фронце, хтосьці партызаніў. Нам ёсць кім ганарыцца».

Як лічыць **міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ,** аб Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне заўсёды важна гаварыць, прычым не толькі 9 Мая. «Нам здавалася раней, што подзвіг нашых дзядоў і бацькоў непарушны, — перакананы ён. — Аднак, як паказвае апошні час, у многіх краінах адбываецца абсалютна па-іншаму». Па словах Дзмітрыя Піневіча, важна, што гэтае вялікае свята беларусы адзначаюць у міры. «Добра, калі і ў будучыні будзе менавіта так», — падкрэсліў

міністр аховы здароўя. Дзядуля Дзмітрыя Піневіча загінуў у 1944 годзе. Ён пахаваны ў брацкай магіле ў Магілёўскай вобласці.

Расказаў міністр і аб укладзе медыцынскіх работнікаў у агульную Перамогу: «У Вялікую Айчынную вайну савецкая медыцына вярнула ў шэрагі 80 % параненых. Загінула 85 тысяч медыцынскіх супрацоўнікаў».

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Лідзія Волкава, якая з першага да апошняга дня аказвала медыцынскую дапамогу параненым, на шчасце, у гэты лік не трапіла, хоць, як прызнаецца, не раз была на валаску ад смерці. «Увесь час трэба было дапамагаць параненым, — згадала тыя падзеі ветэран. — Шмат цярпелі людзі... І бамбёжкі, і абстрэлы, і акружэнні — вельмі цяжкая вайна была».

Дзень Перамогі франтавая медсястра сустрэла ў логаве ворага. «8 мая нашу групу падвезлі да рэйхстага, — расказала Лідзія Кандрацьеўна. — Пад'ехалі туды, абышлі вакол будынка, затым зайшлі ўнутр. Далёка, праўда, не дазволілі. Потым стаім на парозе рэйхстага, чакаем адпраўлення ў часць. Прыходзіць зампаліт, здымае фуражку і кажа: «Таварышы, Перамога! Віншую!» Тое, што мы тады адчулі, цяжка перадаць словамі. Вакол усе радаваліся, цалаваліся, абдымаліся, а ў мяне наступіла такая слабасць, я села на прыступку, абмацала сябе і падумала: няўжо скончылася вайна і я жывая?!»

Людміла Драко сустрэла Перамогу ў Алтайскім краі. Яна — жыхарка блакаднага Ленінграда. Ва ўзросце двух-трох гадоў была эвакуіравана ў Новасібірск, прывезена суседкай па хаце ў Дом малютак. «Я нічога не ведаю пра сваіх бацькоў да гэтай пары, — прызнаецца Людміла Сяргееўна. — Нават не ведаю, як іх звалі. Мне пашанцавала: мяне ўдачырылі ў сакавіку 1945 года. Мой прыёмны бацька — беларус, а прыёмная маці — руская. Так што саюз Беларусі і Расіі — ува мне. Яны мне забяспечылі шчаслівае дзяцінства. Толькі тады, калі я стала на ногі, яны мне сказалі, што я з блакаднага Ленінграда».

Фёдар Фешчанка ўдзельнічаў у беларускай наступальнай аперацыі «Багратыён» і памятае, якім быў Мінск у першы месяц пасля заканчэння вайны. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны расказаў, што прайшоў два фронты: працоўны і сапраўдны. Падлеткам ён разам з бацькамі працаваў у Ніжнім Тагіле на вагонарамонтным заводзе, які з пачаткам акупацыі быў перапрафіляваны ў танкавы завод. «Мы, падлеткі, нават радаваліся, што пачалася вайна, — згадаў Фёдар Сяргеевіч. — Мы выхоўваліся на фільмах «Чапаеў», «Браняносец Пацёмкін», таму нам хацелася паваяваць. Мы так тады разважалі: вось нарэшце мы пакажам гэтай немчуры!»

І паказалі. Усяму свету прадэманстравалі, што Чырвоная Армія — наймагутнейшая ў свеце, што савецкі народ — непераможны. Нам, сучаснаму пакаленню, за шчасце чуць іх аповеды аб вайне — такога не раскажуць у фільмах. Яны, галоўныя героі свята, успамінаюць, як здабывалі Перамогу на фронце і ў складзе партызанскіх злучэнняў, змагаліся з ворагам у тыле. Яны, сведкі тых падзей, нікому не дазволяць перапісаць гісторыю, прынізіць уклад савецкага народа ў Перамогу.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

уявіць». Па словах спікера верхняй палаты парламента, успамінаючы падзеі страшнай вайны і тых, хто загінуў, аддаў сваё жыццё за свабоду і незалежнасць нашай краіны, хто сёння, дзякуй богу, яшчэ з намі, мы разумеем, што мір і спакой — гэта найважнейшае, што можа быць для чалавека. «Самае галоўнае маё пажаданне і мая мара — каб мы жылі ў спакойным свеце, — адзначыла Наталля Качанава. — Не толькі мы, але і тыя, хто ідзе за намі. Каб наша краіна заўсёды была мірнай і спакойнай, каб маладыя пакаленні разумелі, шанавалі гэта і зрабілі ўсё для таго, каб ніколі на нашай зямлі, святой і шматпакутнай, не было такіх страшных падзей, якія прыйшлося перажыць нашаму народу».

Як заўважыў **першы сакратар БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ,** 9 Мая з'яўляецца найважнейшым святам для некалькіх пакаленняў беларусаў. «Сёння Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі робіць акцэнт на комплекс мерапрыемстваў, звязаных з патрыятычным

ДЗЕНЬ РАДАСЦІ, ПАМЯЦІ І ПАДЗЯКІ

У Беларусі ўчора адзначылі адно з самых важных свят у гісторыі краіны — Дзень Перамогі. Для жыхароў краіны гэта не толькі святочны дзень, але і Дзень памяці, глыбокай павагі і ўдзячнасці савецкім воінам, працаўнікам тылу, партызанам і падпольшчыкам — усім, хто набліжаў Перамогу.

ПЕРШЫ КРОК ДА ПЕРАМОГІ

Сёлета святкаванне Дня Перамогі ў Брэсце пачалося не ў легендарнай цытадэлі, а на плошчы Леніна. Тут прайшоў парад з удзелам ваеннай тэхнікі, ваеннаслужачых Брэсцкага гарнізона і органаў пагранічнай службы.

У шэсці калоны «Беларусь памятае. Памятаем кожнага» гэтым разам удзельнічала каля пяці тысяч чалавек. Да 11 гадзін каля 50 тысяч чалавек сабралася на плошчы цырыманіялаў і ў яеваколіцах.

Мерапрыемствы ў крэпасці пачаліся з ускладання кветак да Вечнага агню Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». У Брэсцкай вобласці засталося каля адной тысячы жывых сведкаў вайны, з іх 89 чалавек — удзельнікі баявых дзеянняў. Невялікая група ветэранаў прыбыла на святочнае мерапрыемства. Іх даставілі ў крэпасць на аўтамабілях, для іх на плошчы паставілі крэслы. Ветэранаў цёпла павіншаваў і падзякаваў за Перамогу **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

— Менавіта тут, у Брэсцкай крэпасці, пакладзены пачатак усенароднаму супраціўленню ворагу і ў выніку — Вялікай Перамозе. За яе наш народ заплаціў вялікую цану. Да гэтай пары мы адкрываем новыя старонкі трагедыі, якія прынёс фашызм на нашу зямлю, — сказаў кіраўнік вобласці. — Мы працягваем эстафету стварэння, умацоўваем эканоміку, павышаем якасць жыцця, выхоўваем патрыётаў сваёй краіны. Мы бачым, наколькі гэта важна для бяспекі людзей, для захавання дзяржавы... Мы заўсёды будзем помніць і шанаваць бессмяротны подзвіг нашага народа.

«У КОЖНЫМ РАЁНЕ ЁСЦЬ СЁСТРЫ ХАТЫНІ»

Сотні чалавек учора сабраліся на плошчы Перамогі ў Віцебску. Каля Вечнага агню Мемарыяльнага комплексу ў гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў адбыўся мітынг, у якім удзельнічалі кіраўніцтва вобласці і горада, прадстаўнікі працоўных калектываў і грамадскасці, моладзь і сведкі тых страшных падзей.

«Дзякуючы адвазе і самаахвярнасці дзядоў і прадзедаў, у нас з'явілася магчымасць жыць у свабоднай дзяржаве і пад мірным небам, — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.** — Вызваленчая барацьба з захопнікамі была сапраўды ўсенароднай. Карнікі за гэта жорстка помсцілі — у кожным раёне ёсць сёстры Хатыні — вёскі, якія былі знішчаны з жыхарамі. Страшна ўявіць, колькі не пасталела дзяцей, было паламана чалавечых лёсаў з-за шалёных ідэй і крывавай жорсткасці фашыстаў».

Для ветэрана той далёкай і балючай вайны Мікалая Жарыкава Дзень Перамогі — гэта дзень яго нараджэння, сёлета герой адзначыў 97-годдзе. Амаль за цэлы век на долю мужчыны выпала нямала цяжкасцяў і гора, аднак і сёння ён малады душой, сустракае новую вясну са слязамі на вачах.

Для жыхароў і гасцей Віцебска ў Дзень Перамогі былі арганізаваныя забаўляльныя і музычныя праграмы, лёгкаатлетычная эстафета, выстаўка ваеннай тэхнікі, працавалі атракцыёны, кінатэатр пад адкрытым небам. Завяршыўся вечар святочным салютам.

АРГУМЕНТ СУПРАЦЬ ФАШЫЗМУ

Больш за 25 тысяч жыхароў і гасцей Гомеля прыняло ўдзел ва ўрачыстым шэсці ад плошчы Паўстання да плошчы Леніна. Наперадзе ўпершыню вайскоўцы пранеслі 12-метровы цэнтральны святочны сімвал — Сцяг Перамогі.

Гэта копія таго самага чырвонага сцяга, які 30 красавіка 1945 года быў узняты над рэйхстагам. Калонай па цэнтральнай вуліцы прайшла і ваенная тэхніка.

— Нашы героі — гэта наша гісторыя, гэта наша будучыня! Гэта наш бясспрэчны аргумент супраць фашызму, які і сёння спрабуе праявіць свой звярыны выскал у розных пунктах планеты, і бясспрэчная перавага над сучаснымі «перапісчыкамі гісторыі», — звярнуўся да ўдзельнікаў мітынгу на плошчы Працы **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

Знакамітая гамяльчанка — ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аэліта Самсонава — заклікала землякоў ганарыцца, што нарадзіліся ў такой цудоўнай краіне, якая перамагла фашызм.

Свята працягнулася канцэртнай праграмай і тэматычнай экспазіцыяй на плошчы Леніна, балем у парку каля Палаца Румянцавых і Паскевічаў, выстаўкамі, гульнявымі і спартыўнымі лакацыямі, выязным гандлем і выступленнямі творчых калектываў у скверы каля галоўнага корпуса тэхнічнага ўніверсітэта імя Паўла Сухога.

Урачыстыя мітынгі, шэсці і канцэрты прайшлі ва ўсіх раёнах вобласці.

ГОНАР І БОЛЬ

У Дзень Перамогі гродзенцы выйшлі на цэнтральную плошчу горада з фотаздымкамі сваіх бацькоў і дзядоў. Пасля таго як да Вечнага агню былі ўскладзены кветкі, шматлюдная калона прайшла праз цэнтр горада на плошчу Савецкую, дзе разгарнулася канцэртная праграма.

Узначалілі калону ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Яны размясціліся ў аўтамабілях той эпохі.

— Чырвоны сцяг над рэйхстагам стаў сімвалам перамогі над фашызмам. Савецкі народ не толькі спыніў карычневую чуму, якая пакінула пасля сябе разбурэнне, попел і руіны. У надзвычай кароткі тэрмін ён у адзіным стваральным парыве аднавіў рэспубліку, заклаў аснову для пабудовы і развіцця моцнай, квітнеючай Беларусі. Мы жывём у прыгожай, камфортнай, дагледжанай краіне. Аб мінулай вайне нагадваюць толькі брацкія магілы і воінскія абеліскі. Але мы не забылі цану здабытай свабоды і незалежнасці. У нашых сэрцах жыве боль страты мільёнаў суайчыннікаў, — сказаў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.**

Атмасферу свята дапаўнялі гукі ваенных песень і, вядома ж, салдацкая каша, якую прыгатавалі некалькі вайсковых часцей. У парку імя Жылібера разгарнуліся пляцоўкі з разнастайнымі атракцыёнамі як для дзяцей, так і для дарослых. Мірнае свята аб'яднала ўвесь рэгіён.

АТМАСФЕРА 40-Х

Напэўна, так выглядаў святочны Магілёў у маі 1945-га: тысячы шчаслівых твараў, усмешкі, віншаванні, сцягі, кветкі, паветраныя шары.

А пачалося ўсё з яркага шэсця. Па плошчы Леніна ўрачыстым маршам прайшлі ваеннаслужачыя Магілёўскага гарнізона, ваенізаваных арганізацый, кадэты. Святочную калону, у складзе якой на рэтрааўтамабілях рухаліся і нешматлікія ветэраны, гараджане віталі крыкамі «Ура!» і дзякавалі за Перамогу. У шэсці прынялі ўдзел прадстаўнікі кіраўніцтва горада, сенатары, дэпутаты, працоўныя калектывы, моладзь, грамадскія дзеячы.

На плошчы Славы ўдзельнікі цырымоніі ўсклалі гірлянду і кветкі да мемарыяла і ўшанавалі хвілінай маўчання памяць загінулых герояў.

— Гэты дзень з'яўляецца сімвалам адзінства як для нашага народа, так і для жыхароў нашых братэрскіх краін, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Залітая крывёю, апаленая агнём, разрабаваная вайной, краіна не здалася. Успамінаючы тыя гады, мы ўсё часцей гаворым пра гераізм салдат на фронце. Мы ўдзячны за Перамогу і тым, хто набліжаў яе ў тыле, забяспечваў фронт правізіяй, тэхнікамі, снарадамі. Памяць аб Вялікай Айчыннай вайне і яе праўдзе — гэта наша адказнасць.

На тэрыторыі Беларусі за гады вайны адбылося больш чым 140 карных аперацый, падчас якіх было спалена болей чым 9 тысяч сёл і вёсак, 186 з якіх так і не адрадзіліся. На акупаваных тэрыторыі фашысты стварылі болей чым 260 тысяч лагераў смерці для знішчэння ваеннапалонных і грамадзянскага насельніцтва. У Германію было сагнана амаль 400 тысяч чалавек, з якіх тысячы не вярнуліся дамоў.

— Дзеці, унукі і праўнукі пераможцаў, — звярнуўся да прысутных **старшыня Магілёўскай абласной ветэранскай арганізацыі Анатоль ГЛАЗ.** — Маім голасам сёння вас віншуе 228-тысячная ветэранская арганізацыя. З іх, на жаль, толькі 121 ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Мы павінны разумець, якой цаной заваяваная тая Перамога. Гэта болей чым 27 мільёнаў загінулых, у тым ліку 16 мільёнаў з ліку мірнага насельніцтва. Наш народ выстаяў, мы свабодныя, мы радуемся міру, але гатоўнасць абараніць радзіму для нас сёння раўназначная гарантыі захавацца як народ.

У Магілёве, Бабруйску і ўсіх населеных пунктах Магілёўскай вобласці адбыліся шматлікія канцэрты, выстаўкі, акцыі.

МІРНАЕ НЕБА ТРЭБА ШАНАВАЦЬ

На Міншчыне святочныя мерапрыемствы распачаліся ўскладаннем вянкоў да мемарыяльнага комплексу «Курган Славы».

— Пад'язджаючы да Кургана Славы, кожны раз адчуваеш вельмі складаныя пачуцці — хваляванне, трывогу. Усё гэта змешваецца з радасцю, святочным настроем. Наша пакаленне, на шчасце, не заспела жахаў вайны, але мы, па расказах нашых бабуль, дзядуль, калі яны яшчэ былі жывыя, памятаем пра той час. Сёння галоўнае — не перамагчы ў вайне, галоўнае — яе не дапусціць. Мірнае неба, якое над нашай краінай, трэба шанаваць, — адзначыў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

Пасля заканчэння ўрачыстасцяў на Кургане Славы ён прыняў удзел у шэсці і мітынгу на плошчы Перамогі ў Мінску. Намеснікі кіраўніка цэнтральнага рэгіёна наведалі месцы баявой славы і трагедый вайны, дзе таксама ўсклалі кветкі.

У гістарычна-культурным комплексе «Лінія Сталіна» 8 і 9 мая шмат людзей сабрала відовішчная ваенна-гістарычная рэканструкцыя, прысвечаная Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне. Святкаванні прайшлі ва ўсіх райцэнтрах Міншчыны і горадзе Жодзіне.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,
Наталля КАПРЫЛЕНКА,
Маргарыта УШКЕВІЧ,
Нэлі ЗІГУЛЯ,
Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Фота Андрэя ФЕДАРЦОВІЧА.

АБЕЛІСКІ ПАРАНЕНАЙ ЗЯМЛІ

СЛОВАМ НАБЛІЖАЛІ ПЕРАМОГУ

Подзвіг журналістаў-падпольшчыкаў, якія ў гады акупацыі выпускалі газету «Звязда», увекавечаны ў помніках, мемарыяльных шыльдах і назвах вуліц

А дзякуючы ініцыятыве народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна ў чэрвені 2005 года ў Мінску з'явіўся праспект газеты «Звязда». За вялікія заслугі ў маблізацыі беларускага народа на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны найстарэйшае рэспубліканскае перыядычнае выданне краіны было ўзнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны I ступені (1965 г.) і Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967 г.). «Звязда» — адзінае выданне былога Савецкага Саюза, якое мае баявую ўзнагароду, адзіная газета ў свеце, якой народ паставіў столькі помнікаў.

Такое прызнанне газета заслужыла сваім выхадам у адзін з найбольш трагічных перыядаў у гісторыі беларускага народа — у гады Вялікай Айчыннай вайны. Выпуск падпольнай «Звязды» ў акупаваным Мінску стаў беспрэцэдэнтнай з'явай у гісторыі беларускай і сусветнай журналістыкі, увайшоў у гістарыяграфію як прыклад самаахвярнасці і гераізму беларусаў.

Аднак за гэты подзвіг была заплачана вельмі высокая цана — ад рук акупантаў і іх памагатых загінулі многія журналісты-падпольшчыкі, а таксама тыя, хто ахвяраваў пад патрэбы рэдакцыі сваё жыллё. Доўгі час іх імёны незаслужана не згадваліся, непрызнаныя былі і тыя са стваральнікаў падпольнай газеты, каму пашчасціла выжыць. З рэабілітацыяй дзейнасці мінскіх падпольшчыкаў гістарычная справядлівасць была ўстаноўлена. Некаторыя з тых, хто прымаў удзел у выпуску нелегальнай «Звязды», пасмяротна атрымалі ўзнагароды. Імёнамі Уладзіміра Амельянюка і Вячаслава Нікіфарава ў Мінску былі названыя вуліцы. Памяці журналістаў-падпольшчыкаў у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прысвяцілі асобную экспазіцыю. Імёны людзей, якія ў вельмі складаных умовах, рызыкуючы ўласным жыццём, даносілі да грамадскасці праўдзівую інфармацыю, бераклівa захоўваюцца ў школьных музеях краіны.

Подзвіг журналістаў-падпольшчыкаў увекавечаны ў помніках на плошчы Незалежнасці і на вуліцы Кульман, у мемарыяльных дошках на вуліцах Караля і Беламорскай, на праспекце Незалежнасці ў Мінску, а таксама на востраве Зыслаў у Любанскім раёне, дзе пасля правалу ў кастрычніку 1942 года выдавецкая дзейнасць «Звязды» была адноўлена ў студзені 1943 года. Гэта святыя месцы для кожнага супрацоўніка сучаснай рэдакцыі газеты.

Штогод напярэдадні Дня друку і Дня Перамогі мы наведваем гэтыя месцы, каб прывесці іх у парадак, а таксама аддаць даніну павагі нашым папярэднікам, якія ўнеслі свой уклад у сённяшні мірны дзень. Больш падрабязна аб звяздоўскіх месцах-сімвалах — у нашым матэрыяле.

У логаве ворага

Мемарыяльная дошка на будынку сучаснага Дома друку (перад вайной гэта была друкарня імя Сталіна), які знаходзіцца на сталічным праспекце Незалежнасці, распавядае, што тут у першыя месяцы вайны таемна друкаваліся падпольныя ўлёткі, а ў маі 1942 года быў набраны першы нумар падпольнай «Звязды». Сёння складана ўявіць, што матэрыялы гэтага нумара набіраліся ў логаве ворага — у гады акупацыі ў цяперашнім Доме друку знаходзілася нямецкая друкарня.

Гэта стала магчымым дзякуючы рабочым друкарні: бацьку і сыну Ворановым, Барысу Пупко, Міхаілу Свірыдаву і Броні Гофман, якія з'яўляліся членамі адной з першых падпольных груп Мінска. Пасля таго як падпольшчык Уладзімір Амельянюк, прызначаны рэдактарам падпольнай «Звязды», устанавіў з імі сувязь, рабочыя ажыццявілі набор матэрыялаў першага нелегальнага нумара непасрэдна ў самой друкарні. Усё астатняе, што было патрэбна для выпуску газеты — наборныя касы, паперу, фарбы, гранкі, вярсталкі, — патрыётам удалося незаўважна вынесці.

Слова страляла ва ўпор

У выніку першы падпольны нумар «Звязды» быў надрукаваны 18 мая 1942 года. Гэтая важная падзея адбылася ў доме Міхаіла Воранава і яго сына Міхаіла па вуліцы Рымарскай, 13 (у раёне сучаснай вуліцы Караля). У рацы над гэтым выпускам прымалі ўдзел Уладзімір Амельянюк (рэдактар), Міхаіл Міхайлавіч і Міхаіл Паўлавіч Воранавы, Барыс Пупко (наборшчык), Броня Гофман (дастаўляла шрыфты і матэрыялы), Цімафей Аляксандравіч Трафімюк, Дар'я Іванаўна Трафімюк, Алена Паўлаўна Саланец.

Арыгіналы першага падпольнага нумара, які быў неаднаразова выдадзены ў чэрвені 1942 года ў памяць аб загінулым рэдактары Уладзіміры Амельянюку, сёння захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, а таксама ў рэдакцыі газеты «Звязда». «...Бязлітасна знішчайце фашысцкіх гадаў, пашырайце партызанскую барацьбу. Зрабіце ўсё, каб наблізіць час разгрому і гібелі крывавага фашызму!» — заклікалі журналісты-падпольшчыкі. Кожнае слова, быццам куля, страляла ва ўпор. Сваім з'яўленнем «Звязда» ашаламіла фашыстаў. Мінскія падпольшчыкі гучна заявілі аб сваім існаванні.

Для пошуку падпольнай друкарні з Берліна выклікалі вопытных разведчыкаў. Гітлераўцы ўсведамлялі: знішчэнне самай вядомай і аўтарытэтнай беларускай газеты нанясе непапраўны ўрон падпольнаму руху. Тым, хто ўкажа на нелегальную друкарню, акупанты абяцалі заплаціць 75 тысяч нямецкіх марак — па тым часе вялізарныя грошы. У грамадскіх месцах і на заводах пачаліся павальныя вобыскі і арышты: тых, у каго знаходзілі хоць бы адзін экзэмпляр газеты, расстрэльвалі.

Незайздросны лёс напаткаў бацьку і сына Ворановых, на кватэры ў якіх быў надрукаваны першы падпольны выпуск «Звязды». Па інфармацыі падпольшчыка Васіля Сайчыка, іх выпадкова выдала родная цётка: «Яе затрымалі ў краме, у яе было дзесяць хлебных картак. Спыталі, дзе яна іх бярэ, тая сказала, што Воранаў даў. Паехалі да Воранава, зрабілі стараны ператрус».

Як высветлілася, на кватэры падпольшчыкаў таксама друкаваліся хлебныя карткі, карткі для дадатковага пайка, пашпарты, біржавыя карткі, даведкі з месца працы, падробліваліся пячаткі і штампы. Менавіта дзякуючы Міхаілу Воранаву мінскім падпольшчыкам удалося здабыць два экзэмпляры спіса шпіёнаў, якія праз партызанскую брыгаду «Дзядзькі Колі» былі адпраўлены ў Маскву.

За гэта, а таксама за ўдзел у выпуску газеты, была заплачана вельмі высокая цана: у канцы 1942 года ў фашысцкім засценку загінула сям'я Воранавых — бацька, сын і яго жонка. Сёння на адным з дамоў па сучаснай мінскай вуліцы Караля, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны стаяла іх хата, у якой быў надрукаваны першы падпольны нумар «Звязды», устаноўлена мемарыяльная дошка.

Рэдактар — Герой

Трагічна склаўся лёс і першага рэдактара падпольнай «Звязды» Уладзіміра Амельянюка. Рэдакцыю ён прыняў у самы небяспечны момант. Пасля таго як у Мінску пачаліся масавыя арышты, ён вымушаны быў пакінуць горад. Пасля вайны ў Мінску ўзнікла легенда, што Амельянюк загінуў у Берліне, але гэта не адпавядае рэчаіснасці. Ён выжыў, вярнуўся ў родны горад, працаваў у Акадэміі навук, быў членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР, доктарам гістарычных навук, прафесарам. Ён напісаў больш за 200 навуковых прац, у тым ліку манаграфіі «Беларусь у перыяд Айчыннай вайны», «Беларускі народ у Айчыннай вайне», «Беларусь у перыяд Айчыннай вайны». Ён быў членам рэдкалегіі шматтомнага выдання «Гісторыя Беларускай ССР», рэдактарам і аўтарам шматлікіх кніг і артыкулаў. Ён быў адным з аўтараў і рэдактараў кнігі «Беларусь у перыяд Айчыннай вайны», якая ў 1946 годзе была ўзнагароджана Сталінскай прэміяй. Уладзімір Амельянюк быў адным з ініцыятараў стварэння Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, а таксама ў рэдакцыі газеты «Звязда». «...Бязлітасна знішчайце фашысцкіх гадаў, пашырайце партызанскую барацьбу. Зрабіце ўсё, каб наблізіць час разгрому і гібелі крывавага фашызму!» — заклікалі журналісты-падпольшчыкі. Кожнае слова, быццам куля, страляла ва ўпор. Сваім з'яўленнем «Звязда» ашаламіла фашыстаў. Мінскія падпольшчыкі гучна заявілі аб сваім існаванні.

Помнік на вуліцы Кульман, дзе патрыёты падрыхтавалі другі і трэці газетныя выпускі.

Шыльда на Доме друку, дзе ў гады акупацыі быў набраны першы падпольны выпуск «Звязды».

самай вядомай і папулярнай па тым часе беларускай газеты ўчарашні студэнт Камуністычнага інстытута журналістыкі ўзначаліў у нявопўныя 25 гадоў. Праз некалькі дзён пасля выхаду першага нелегальнага нумара (па афіцыйных звестках, 26 мая 1942 года) у ходзе перастрэлкі з агентам СД Уладзімір Амельянюк быў забіты каля Чырвонага касцёла ў Мінску. Аптэка непадалёк ад касцёла, каля якой адбылася трагедыя, працягы час з'яўлялася для падпольшчыкаў месцам сустрэчы.

«Яго цела ляжала каля аптэкі не адзін дзень, — удакладняла падчас інтэрв'ю пляменніца рэдактара падпольнай «Звязды» Надзея Амельянюк. — Маці Уладзіміра Амельянюка, мая бабуля, неаднойчы праходзіла каля нежывога сына, але нічога зрабіць не магла: інакш выдала б і сябе, і іншых падпольшчыкаў. Магілы дзядзька не мае...»

Няма яе і ў роднай сястры журналіста. Па дарозе ў эвакуацыю ў машыну, у якой ехала Зінаіда Амельянюк, трапіла бомба — жанчына загінула разам з двума дзецьмі. Яе муж, ваеннаслужачы, не вярнуўся з фронту. Бацьку Уладзіміра Амельянюка, Сцяпана Кандратавіча, які таксама супрацоўнічаў з Мінскім падпольным гаркамам КП(б)Б, замучылі ў Трасцянцы. Маці, Паўліна Сцяпанаўна, памерла ўсяго праз некалькі дзён пасля Перамогі: 24 мая 1945 года яна ўпала на вуліцы — жаночае сэрца не вытрымала пакут, якія іх сям'і прынесла вайна. Сын будучага Героя Савецкага Саюза загінуў па дарозе ў эвакуацыю.

Уладзімір Амельянюк — адзіны рэдактар у час Другой сусветнай вайны, якому было прысвоена найвышэйшае званне — Герой Савецкага Саюза (падобных прыкладаў у гісторыі СССР не было). На тым месцы, дзе ён загінуў (сучасная плошча Незалежнасці), 24 верасня 1980 года быў адкрыты помнік першаму рэдактару падпольнай «Звязды», а таксама іншым журналістам-падпольшчыкам, якія падчас акупацыі ўдзельнічалі ў выданні газеты. Помнік журналісту-Герою ўстаноўлены і на тэрыторыі Самахвалавіцкай сярэдняй школы, дзе ён вучыўся.

Насупраць друкарні — гестапа

Пасля трагічных падзей падпольная рэдакцыя вымушана была змяніць прапіску — працягваць выпуск газеты вырашылі ў хаце Таццяны Якавенкі па вуліцы з сімвалічнай назвай Выдавецкая (цяпер Кульман). Тут былі надрукаваны другі і трэці нумары падпольнага выдання. Аб подзвігу журналістаў-падпольшчыкаў, якія да гэтага мелі дачыненне, сведчыць сціплы помнік, усталяваны на вуліцы Кульман (насупраць Камароўскага рынку) — акурат на месцы хаты, дзе і днём, і ноччу кіпела работа, нягледзячы на тое, што насупраць падпольнай рэдакцыі знаходзілася гестапа.

Над другім і трэцім выпускамі падпольнай газеты працаваў нявялікі рэдакцыйны калектыў: Вячаслаў Нікіфараў, Ядвіга Савіцкая, Уладзімір Казачонак, Хасан Аляксандровіч, Сяргей Благаразумаў, Клаўдзія Фалдзіна і Анастасія Карпусенка. Дагэтуль няма адзінага меркавання, на каго пасля гібелі Уладзіміра Амельянюка былі ўскладзены рэдактарскія функцыі: і Вячаслаў Нікіфараў, і Ядвіга Савіцкая ў роўнай ступені адказвалі за выхад газеты.

Сын наборшчыка падпольнай «Звязды» Барыс Александровіч доўгі час сябраваў з нашай рэдакцыяй, нават меў пасведчанне ганаровага карэспандэнта «Звязды».

На востраве Зыслаў, дзе выходзіла партызанская «Звязда».

Менавіта ад яго мы даведаліся шмат цікавых дэталяў, звязаных з выхадам выдання ў акупаваным Мінску. З вуснаў бацькі Барыс Александровіч ведаў, што выпускаць газету было вельмі складана: увесь час нечага не хапала — то паперы, то фарбы, то друкарскіх прылад. Яго маці, Галіна Александровіч, пашыла з марлі каля двухсот мяшэчкаў, у кожным з якіх захоўвалася літара. Пасля таго, як нумар быў адцэнсаваны, літары зноў складваліся ў свае «рэзервуары».

Кожны падпольны нумар ствараўся ў найцяжэйшых умовах: паўсюль былі шпіёны і правакатары. Калі Ядвіга Савіцкая займалася апрацоўкай матэрыялаў або пісала іх, яе дачка заўсёды знаходзілася на вуліцы, маці — у дварэ. Пры найменшым падазрэнні падпольшыца атрымлівала сігнал і хавала матэрыялы ў падаконнік. «Пры добрых умовах газету можна было зрабіць за два-тры дні, а рабілі яе месяцамі, — расказвала Савіцкая. — Не паспявалі ўзяць у рукі аловак, як паступае сігнал трывогі. Заходзіць у кватэру хто-небудзь — усялякая праца спыняецца».

Акрамя непасрэднай журналісцкай работы, Ядвіга Савіцкая неаднойчы насіла надрукаваную газету ў мястэчкі і сёлы. Па яе словах, былі моманты, калі газету аддавала сялянам публічна, не хаваючыся. Пры гэтым не было ні аднаго выпадку, каб з-за страху нехта адмовіўся яе ўзяць. Насельніцтва той ці іншай вёскі хутка знаёмілася са зместам выдання, якое затым перадавала іншым людзям. Падпольшчыкі, якія прыходзілі ў гэты населены пункт другі раз, былі тут жаданымі гасцямі.

Загінулі разам з дзецьмі

Чацвёрты нумар нелегальнай «Звязды» выйшаў на кватэры сям'і Хадасевічаў на вуліцы 3-я Лінія, 26 (у раёне сучасных мінскіх вуліц Цнянская і Беламорская). Выпуск пятага планаваўся на 27 верасня 1942 года. Аднак у свет ён так і не выйшаў: у ноч на 26 верасня гітлераўцы арыштавалі 21 падпольшчыка, сярод якіх быў і Вячаслаў Нікіфараў, на якім пасля гібелі У. Амельянюка ляжала адказнасць за выхад газеты.

Пасля арышту Вячаслаў Нікіфараў трапіў у СД, дзе падпольшчыка жорстка катавалі. Зверскімі спосабамі яго прымушалі адмовіцца ад камуністычнай партыі. Вядома, што 8 снежня 1942 года В. Нікіфарава перавезлі ў мінскую турму, пасля — зноў у СД. Далейшы лёс Вячаслава Нікіфарава невядомы. Указам 10 мая 1965 года Вячаславу Кандратавіч пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Яго імем названая адна з мінскіх вуліц, памяць аб падпольшчыку захоўваецца ў навучальных установах сталіцы. Адна з мінскіх школ носіць імя падпольшчыка.

Пётр і Альбіна Хадасевічы, на кватэры якіх стваралася чацвёртыя і пяты нумары падпольнай «Звязды», разам са сваімі сынамі Канстанцінам і Паўлам загінулі ў фашысцкай турме (па іншых звестках, у Трасцянцы). На доме, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася кватэра Хадасевічаў (на цяперашняй вуліцы Беламорская, 7), якую патрыёты аддалі пад патрэбы рэдакцыі, устаноўлена мемарыяльная дошка. Лёс іншых арыштаваных падпольшчыкаў, якія былі задзейнічаны ў выдавецкай дзейнасці, не вядомы да сённяшняга часу.

Газета-партызанка

Пасля правалу Мінскага падполля ў студзені 1943 года выпуск «Звязды» быў адноўлены ў зоне партызанскіх злучэнняў у Любанскім і Салігорскім раёнах. У гэтай зоне першы нумар газеты-партызанкі выйшаў 27 студзеня 1943 года. Над выпускам «Звязды», як і «Чырвонай змены» (маладзёжная газета таксама адналва спынёную вайной дзейнасць), у партызанскай зоне працавала ўсяго некалькі чалавек: былы рэдактар Любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец, карэспандэнт даваенай «Советской Белоруссии» Георгій Шчарбатаў, супрацоўнікі Капаткевіцкай раённай газеты Амяльян Шурпач, Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка і Ніна Цылько. Узначальваў абагульненую рэдакцыю дзвюх газет даваенны рэдактар «Чырвонай змены» Міхаіл Барашкаў.

У партызанскай зоне было выпушчана 105 нумароў «Звязды». У тыле ворага выйшла 48 выпускаў «Чырвонай змены». Уклад гэтых дзвюх газет у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі вельмі істотны. Журналісцкае слова праўдзіва расказвала аб падзеях на фронце, выкрывала сапраўдныя намеры акупантаў, заклікала папаўняць шэрагі народных мсціўцаў. Насельніцтва з нецярпеннем чакала чарговыя выпускі газет, чытала кожную змешчаную публікацыю і, вядома, добра разумела, што кожны радок быў напісаны ў неверагодна складаных умовах, з рызыкай для жыцця. Подзвіг журналістаў, якія выдавалі газеты ў партызанскай зоне, увекавечаны ў мемарыяльным комплексе, створаным на востраве Зыслаў.

* * *

Нядаўна супрацоўнікам сучаснай рэдакцыі «Звязды» удалося ўстанавіць новае памятное для калектыву месца. На вуліцы Усходняй, на доме пад нумарам 28, корпус 1, устаноўлена мемарыяльная шыльда, якая сведчыць аб тым, што на гэтым месцы знаходзілася хата, у якой у 1941—1942 гадах размяшчалася канспіратыўная кватэра Мінскага партыйнага падполля. Яе ўтрымлівалі бацька і сын Амельянюкі, якія загінулі ад рук нацыстаў вясной 1942 года.

Гэтае месца стане яшчэ адным прыпынкам у маршруце памяці, які кожны год напярэдадні Дня друку і Дня Перамогі здзяйсняюць журналісты найстарэйшага рэспубліканскага выдання краіны з гераічнай гісторыяй.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора **ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»** (продавец, 222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б, +375 (029) 351 10 33)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ ЭЛЕКТРОННЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2010 г. в., регистрационный знак ОК-5 5673, заводской № У397032230410544	4540	8 496,00	849,00
2	Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2011 г. в., регистрационный знак ОК-5 3151, заводской № У39ЭО32230411682	04541	15 600,00	1 560,00
3	Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-6, 2009 г. в., заводской № 80	4631	3 696,00	369,00
4	Плуг болотный навесной ПБН-6-50	119600	1 728,00	172,00
5	Камнеуборочная машина УКП-0,7; 1989 г. в.	5659	5 328,00	532,00

Стоимость снижена на 60 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

Электронные торги состоятся 24 мая 2023 года в 11.00.

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее 22 мая 2023 года включительно до 17.00*. Консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

*Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП). Оператор ЭТП **в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию)** с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY» принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).

Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», адрес электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321.

Контактные телефоны: + 375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by, и Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Задатки для участия в электронных торгах перечисляются не позднее 22 мая 2023 года включительно на расчетный счет № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 02.03.2022, 16.04.2022, 11.05.2022, 09.06.2022, 23.07.2022, 23.07.2022, 08.09.2022, 25.10.2022.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

УНП 600077220

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион по продаже**

ЗДАНИЯ КОНТОРЫ с инв. № 630/С-47139

(составные части и принадлежности: бетонная площадка, противопожарный резервуар, сети водоснабжения, сети водоотведения, сети электроснабжения), **общей площадью 385,8 кв. м, адрес: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Школьная, 30 (далее – Объект).**

Объект расположен на земельных участках с кадастровыми номерами 623884308601000407 (право постоянного пользования) площадью 1,9100 га, 623884308601000758 (право постоянного пользования) площадью 0,0002 га, *который имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки, водоема – р. № 1, пл. 0,0002 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 53 568,00** бел. руб.

Начальная цена снижена на 10%.

Задаток 10 % от начальной цены – **5 356,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (Покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 06.12.2022.

Аукцион состоится **23.05.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.05.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64; (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ПМК № 187»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 5337 А28, 2008 г. в., 4 куб. м, дизель, мкпп, цвет белый, № кузова, шасси У3М5337А280000472, пробег 166 т. км	16 632,00	1 663,20	831,60
2	Грузовой бортовой МАZ 6303 А5, 2008 г. в., дизель, мкпп, цвет белый, № кузова, шасси У3М6303А590001003, пробег 313 т. км. Разрешенная масса 24500 кг. Масса без нагрузки – 11200 кг	27 540,00	2 754,00	1 377,00
3	Седельный тягач МАЗ 5440 А5, 2008 г. в., дизель, мкпп, цвет белый, № кузова, шасси У3М5440А580000162, пробег 280 т. км. Разрешенная масса 18450 кг. Масса без нагрузки 7800 кг	13 932,00	1 393,20	696,60
4	Экскаватор ЕК-14-20, 2009 г. в., двигатель Д-245, дизель, мкпп, з. н. 3996, цвет желтый, пробег 3,6 т. км	33 156,00	3 315,60	1 657,80
5	Ножницы гильотинные с наклонным ножом СТД9АН	15 940,80	1 594,08	797,04
6	1. Системный блок AMD 1,93 Ггц ОЗУ 512 Мб HDD 512 Гб DVD. 2. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 80 Гб DVD. 3. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 2 Гб HDD 150 Гб DVD. 4. Системный блок Pentium Dual 2,5 Ггц ОЗУ 1,93 Гб HDD 320 Гб CD R. 5. Системный блок AMD Athlon 2 2,7 Ггц ОЗУ 1 Гб HDD 250 Гб, DVD. 6. Монитор FLATRON L1718S-SN; 7. Монитор FLATRON L1719S. 8. Монитор FLATRON L1742S. 9. Монитор FLATRON L1750U. 10. Монитор FLATRON L1751SQ. 11. Монитор FLATRON L1750SQ. 12. Принтер XEROX PHASER 3117. 13. Принтер XEROX PHASER 3117. 14. Принтер XEROX PHASER 3117. 15. Принтер SAMSUNG ML2010PR. 16. Принтер XEROX PHASER 3122	1 000,65	100,07	50,03
7	1. Мини-АТС, aria soho Digital Hybrid PABXforZOHO. 2. Набор мебели «Виктория Люкс 5». 3. Устройство термопереплета UNIBIND XU 138. 4. Факсимильный аппарат Panasonic KX-FT 982RU. 5. Антенна СА-600, цифровой спутниковый ресивер GS 7300	739,80	73,98	36,99
8	1. Подмости инвен. Шарн.-панельн. ПШ-000 А (с настилом); 2. Сейф металлический. 3. Шкаф металлический для документов. 4. Шкаф металлический для одежды. 5. Бетоносмеситель, BWE 250К. 6. Бункер БП – 1,0	3 026,92	302,69	151,35
9	Отделочная станция 2М359	4 197,96	419,80	209,90
10	Контейнер металич. М-К2-2-15	1 985,04	198,50	99,25
11	Вагон-дом	548,64	54,86	27,43
12	Вагон-бытовка строительная на колесах	714,96	71,50	35,75
13	Вагон-бытовка строительная	548,64	54,86	27,43
14	Станок ПРО-10 (правильно-отрезной станок)	1 755,91	175,59	87,80
15	Станок профилегибочный МГ-0080-П-М	1 975,40	197,54	98,77
16	Станок токарно-винторезный 1К62	2 755,19	275,52	137,76
17	Установка пуско-зарядная ENERGY1000 START 230-400	1 065,69	106,57	53,28
18	1. Захват 6 м. 2. Захват ГУИЛ.484135.009-001	2 952,01	295,20	147,60

В отношении лотов №№ 1-18 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее объявление размещалось в газете «Звязда» № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 11

Местонахождение лотов №№ 1-11, 13-18: Минская область, г. Молодечно, ул. Т. Дудко, д. 10.
Местонахождение лота № 12: Минская обл., г. Молодечно, ул. Нагорная, д. 5

Дата и время проведения торгов	**23 мая 2023 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	с 10.00 10 мая 2023 года до 16.00 19 мая 2023 года

Условия для участия в торгах:

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «ПМК № 187», проводимых 23.05.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **Сергей Владимирович, +375296109357.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Информация о продавце	**ОАО «Передвижная механизированная колонна № 187», в лице Ликвидатора – ООО «КАНО», тел.: 80173958917; +375293928906 (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 10)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09; BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Лоевский КБО»** (УНН 400028996), 247095, Гомельская обл., г.п. Лоев, ул. Ленина, 24а, тел./факс +375 232 31-59-72/25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 мая 2023 г. с 09.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Кресло парикмахера (инв. № 2305), 2006 г. в. Сушуар BS-007 (инв. № 2318), 2008 г. в.	75,00
2	Гладильный каток (инв. № 2309), 2007 г. в.	55,00
3	Форма метал. кольца КС-10,9 (инв. №№ 2552, 2553, 2554), 2013 г. в. (3 ед., некомплект)	330,00

Местонахождение – г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, 77.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 11.05.2023 г. 09.00 по 22.05.2023 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 15.04.2023 г.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09; BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Брагинский КБО»** (УНН 400032430), 247632, Гомельская область, г.п. Брагин, ул. Советская, 31, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **23 мая 2023 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

ПРЕДМЕТ ТОРГОВ – ИМУЩЕСТВЕННЫЙ КОМПЛЕКС:

1. капитальное строение с инв. № 343/С-95775, здание дома быта, по адресу: Гомельская обл., Брагинский р-н, г. п. Брагин, ул. Советская, 31, общ. пл.– 1475,9 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка, подвал, ограждение, покрытие. Кадастровый № земельного участка 320355100003000001.

2. капитальное строение с инв. № 343/С-95776, здание гаража-склада, по адресу: Гомельская обл., Брагинский р-н, г. п. Брагин, ул. Советская, 31/1, общ. пл. – 442,4 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка, холодная пристройка. Кадастровый № земельного участка 320355100003000001.

3. капитальное строение с инв. № 343/С-95777, здание котельной, по адресу: Гомельская обл., Брагинский р-н, г. п. Брагин, ул. Советская, 31/2, общ. пл. – 118,1 кв. м. Составные части и принадлежности: тамбур, холодная пристройка. Кадастровый № земельного участка 320355100003000001.

4. капитальное строение с инв. № 343/С-95893, трансформаторная подстанция, по адресу: Гомельская обл., Брагинский р-н, г. п. Брагин, ул. Советская, 31А, общ. пл. – 9,9 кв. м. Кадастровый № земельного участка – 320355100001001031.

5. Оборудование – 5 ед.: бензопила (н/с), н/у г. в., инв. № 507; котел водонагревательный, 2001 г. в., инв. № б/н; котел водонагревательный, 2001 г. в., инв. № б/н; МШ обувная (заклепочная), н/у г. в., инв. № 184; комплект оборудования парикмахера (н/к), н/у г. в., инв. № 228.

Начальная цена предмета торгов – 427 446,00 бел. руб. с НДС.

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 09.00 11.05.2023 г. по 17.00 22.05.2023 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 29.03.2023 г.

МАЛЮНКІ І ЎРАЖАННІ

Пераможцы конкурсу «Хатынь вачыма дзяцей» пабывалі ў Палацы Незалежнасці

Пасядзець на канапе ў Зялёнай зале, дзе ў 2015 годзе 17 гадзін запар вяла перагаворы нармандская чацвёрка; пабываць у Вялікай зале перагавораў, дзе кіраўнік Беларусі праводзіць нарады найвышэйшага ўзроўню; падзівіцца на экспанаты ў музеі сувеніраў, якія са шматлікіх краін трапілі сюды ў якасці падарункаў Прэзідэнту; палюбавацца прыгажосцю зімовага саду... Гэта і шмат што іншае бачылі і рабілі госці Палаца Незалежнасці — пераможцы патрыятычнага конкурсу малюнкаў «Хатынь вачыма дзяцей», у якім удзельнічала больш як 1500 юных мастакоў з усяе Беларусі.

Карціна «Голас Хатыні» навучэнцаў гімназіі-каледжа імя І. Ахрэмчыка.

Па ініцыятыве Прэзідэнта, з 20 найлепшых работ дзяцей і моладзі зладзілі экспазіцыю, якую змясцілі ў Зале ўрачыстых цырымоній Палаца Незалежнасці, а аўтараў найлепшых малюнкаў запрасілі сюды на экскурсію. Паглядзець, дзе працуе кіраўнік краіны і дзе адбываюцца найбольш значныя для краіны сустрэчы і ўрачыстасці, прыехалі больш за 100 чалавек.

Самы малодшы ўдзельнік — **першакласнік Арцемій Сальнікаў з Баранавічаў** — не толькі

Першакласнік Арцемій САЛЬНІКАЎ з Баранавічаў.

добра малуе і ведае на памяць «Барадзіно». Яго «фантазійная» мама Ксенія кажа:

— Я бачу па сыне, што ўдзел у конкурсах развівае яго, таму мы стараемся па магчымасці бракуем за ўсё. Задумку карціны стваралі ўсёй сям'ёй. На малюнку два разарваныя чорна-белыя здымкі са званамі.

Развалiны спаленай вёскі адлюстравала ў сваёй карціне, якая атрымала дыплом III ступені па Брэсцкай вобласці, **Марыя Шкут, вучаніца 8 «А» класа сярэдняй школы № 2 г. Ляхавічы.** На малюнку хлопчык, якога абдымае маці, і абодва яны плачуць.

— Падчас работы над малюнкам я адчувала жаль да ўсіх людзей, сваякі якіх загінулі ў Хатыні, і пастаралася перадаць праз малюнак горыч маці і сына, якія страцілі ў гэтай вёсцы свайго мужа і бацьку. Радасць ад перамогі ў конкурсе была вялізная, бо я не думала, што прайду ажно на абласны этап і тым больш займу прызавое месца, — падзялілася эмоцыямі дзяўчына.

Тэма вайны блізкая мастачцы, у якой ваяваў прадзед і вярнуўся дадому з чатырма ўзнагародамі, у тым ліку медалём «За адвагу»:

— Ён здзейсніў подзвіг, пайшоўшы ў контрнаступленне, і забяспечыў праход танкавых войскаў. Штогод мы на 9 мая стараемся збірацца ўсёй сям'ёй, разглядаем яго ўзнагароды, і наш дзядуля расказвае нам пра свайго бацьку, які ён быў, што адчуваў, — згадала Марыя Шкут.

Лізавета Жур, адзінаццацікласніца сталічнай школы № 128, заняла другое месца ў конкурсе ва ўзроставай катэгорыі 16—18 гадоў. Яна намалявала карціну ў тэхніцы вугалем, што сімвалізуе жах, горыч і трагедыю Хатыні.

Лізавета ЖУР, адзінаццацікласніца сталічнай школы № 128.

— На карціне дзяўчынка Соня, якая ацалела ў гэтым пекле. Над дзіцем прывід яе маці, якая абаронвае дачку. Дзяўчынка засталася зусім адна ў лесе пасля перажытых жахаў, і яе эмацыянальны стан перадае пачуцці ўсіх людзей, якія перажылі жах вайны. Аднак на палатне ёсць надзея, якая адлюстравана ў выглядзе пацеркі з парваных кораляў, — расказала пра малюнак педагог школы Вольга Белавус.

Ліза ўжо неаднойчы перамагала ў розных конкурсах, так што гэта пэўным чынам увайшло ўжо ў звычку, прызналася дзяўчына і дадала:

— Тут вельмі прыгожа, і я хачу ўсё гэта намаляваць.

Васьмігадовая Ганна Гулак, вучаніца Гарадзішчанскай пачатковай школы ў Мінскім раёне, падзялілася:

— У сваёй карціне я хацела паказаць эмоцыі, якія ў час вайны перажывалі людзі, і мама абяцала, што мы абавязкова з'ездзім у Хатынь. Я лічу, што памяць пра тыя часы павінна быць у кожнага ў галаве.

Дзве гадзіны экскурсіі прайшлі імгненна, кажуць госці, і па бляску ў вачах відаць, наколькі яны ўражаны веліччу будынка. Памяць пра безліч пакояў, вялікія плошчы, прыгожае аздабленне і, вядома, музей падарункаў у выглядзе тысяч фотаздымкаў, зробленых на памяць юнымі мастакамі, разляцяцца разам з імі ў розныя куточкі краіны. А мінімум адзін новы экспанат, наадварот, зойме сваё месца ў музеі. Гэта карціна «Голас Хатыні», створаная да конкурсу навучэнцамі гімназіі-каледжа імя Ахрэмчыка, якія пасля наведвання Хатыні вырашылі стварыць агульнае палатно. Аўтарства сімвалічна належыць 75 чалавекам — па колькасці дзяцей, загінулых у страшна вядомым месцы. Адзін са стваральнікаў карціны Глеб Арказаў, другакурснік гімназіі-каледжа, падзяліўся ўражаннямі:

— 80-годдзе хатынскай трагедыі — дата, якая грымела на ўсю краіну. Мы на месцы рабілі замалёўкі, з якіх паэтапна выбудоўвалася адзіная карціна. Асноўныя кампазіцыйныя моманты ўзгаднялі, ў адно цэлае злучалі настаўнікі. І нам вельмі прыемна, што наша карціна будзе ў месцы, дзе працуе Прэзідэнт. У Палацы вельмі прыгожа — усё бліскучае, мармуровае, зіхатлівае.

Напрыканцы экскурсіі вучні пагулялі па зімнім садзе і палюбаваліся экзатычнымі раслінамі, а перад ад'ездам паглядзелі невялікі фільм пра Палац Незалежнасці. Разыходзіліся натхнёнымі і ўражанымі, з надзеяй вярнуцца сюды яшчэ раз, а самае галоўнае — амаль кожны стараўся зрабіць як мага больш фота, каб адлюстраваць убачанае ў будучых карцінах.

Марыя ШКУТ, вучаніца 8 «А» класа сярэдняй школы № 2 г. Ляхавічы.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Грамадская думка

ПАКУЛЬ ЖЫВЁМ — ПОМНІМ

Больш за 90 % беларусаў ганарацца, што жывуць у краіне, якая здабыла Перамогу ў Вялікай Айчыннай

Такія даныя тэлефоннага сацыялагічнага апытання прывёў намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікалай СУХОЦКІ. Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі правёў з 27 сакавіка да 11 красавіка тэлефоннае апытанне насельніцтва «Грамадская думка аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, гістарычнай памяці». Выбарка — 902 рэспандэнты.

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанне: **«Ці можаце вы з упэўненасцю сказаць: я ганаруся тым, што жыву ў адной з краін, якія атрымалі Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне?»**

«Так, я абсалютна ў гэтым упэўнены» — так адказалі 92 % апытаных. «Так, але я пра гэта ўспамінаю толькі ў дні святкавання Перамогі» — 3,4 %. «Не, я не бачу падстаў для гонару за краіну з гэтай нагоды» — 1,1 %. «Не, не магу: мне ўсё роўна, у якой краіне я жыву» — 0,5 %. Не змаглі адказаць — 3 %.

«Для жыхароў нашай краіны ў цэлым уласцівыя цэльнасць, пераемнасць гістарычнай памяці, асабліва ўспрыманне гісторыі Беларусі праз прызму падзей ВАВ. Узважаная пазіцыя ўспрымання ўкладу Беларусі ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне паказальная. Цяпер у свеце фіксуецца трэнд на сек'юрытызацыю гісторыі, які праяўляецца ў яе асэнсаванні як сферы, наўпрост звязанай з нацыянальнай бяспекай, пры гэтым для Беларусі важна не пераглядаць, не скажаць гісторыю, каб дагадзіць сабе, ёсць дакладная пазіцыя насельніцтва па гэтым пытанні, разумення таго, што мы жывём у краіне-пераможцы, усведамленне канкрэтнага ўкладу Беларусі ў агульную перамогу савецкага народа. У цэлым беларусы ставяцца трапятліва і беражліва да гісторыі ВАВ, шануюць жывых ветэранаў і памятаюць загінулых герояў», — адзначыў Мікалай Сухоцкі.

Таксама апытаным прапаноўвалася адказаць на пытанне: **«Як часта вы наведваеце месцы памяці герояў Вялікай Айчыннай вайны?»**

«Наведваю рэгулярна» — так адказалі 17,1 % рэспандэнтаў. «Наведваю час ад часу» — 67,5 %. «Не наведваю» — 14,7 %. Не змаглі адказаць — 0,7 %.

«Такія высокія лічбы сведчаць аб той практыцы, якая склалася ў беларускага народа, — абавязковае шанаванне месцаў памяці герояў ВАВ. Сёння актыўна развіваецца ваенна-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, якое ў многім будуецца на павазе да памяці герояў той вайны, у тым ліку наведвання, добраўпарадкавання месцаў іх подзвігаў», — падкрэсліў намеснік дырэктара.

Рэспандэнтам таксама прапаноўвалася адказаць на пытанне: **«Як вы ацэньваеце свае веды аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны?»**

«Я ведаю ключавыя падзеі ваенных гадоў» — так адказалі 48 % апытаных. «Мае веды аб вайне носяць фрагментарны, урыўкавы характар» — 24,8 %. «Я маю поўнае і ўсебаковае ўяўленне аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны» — 18,4 %. «Я практычна нічога не ведаю аб Вялікай Айчыннай вайне» — 2,6 %.

«Тэматыка Вялікай Айчыннай вайны, нягледзячы на тое што прайшло амаль 80 гадоў пасля Вялікай Перамогі, будзе і надалей знаходзіцца ў трэндзе інфармацыйнага парадку дня Беларусі. Гэтыя апытанні паказваюць, што большасць беларусаў цікавяцца гісторыяй у цэлым, добра ведаюць мінулае сваёй краіны», — сказаў Мікалай Сухоцкі.

У апытаных таксама спыталі: **«З чым з ніжэйпералічанага ў вас, у першую чаргу, асацыюецца ўдзел Беларусі і беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне?»**

«Масавы партызанскі рух» — так адказалі 58,1 % апытаных. «Абарона Брэсцкай крэпасці» — 56,8 %. «Нацыянальная трагедыя» — 51,4 %. «Вызваленне Беларусі ад захопнікаў» — 50,6 %. «Цяжкія страты беларускага народа» — 49,1 %. «Супраціўленне мінскіх падпольшчыкаў» — 35,1 % рэспандэнтаў. Не змаглі адказаць — усяго 1,5 % рэспандэнтаў.

«Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што ў грамадскай думцы аб удзеле Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне ў грамадзян адсутнічае толькі адна асацыяцыя, адна падзея, якая значна вылучалася б на фоне іншых. Па сутнасці, усе названыя пазіцыі дапаўняюць адна адну», — адзначыў вучоны-сацыёлаг.

«Наяўнасць такіх высокіх паказчыкаў па пераважнай большасці пазіцый сведчыць аб тым, што грамадзяне дакладна разумеюць беларускі ўклад у Перамогу і эфектыўнасць гістарычнай палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне», — дапоўніў намеснік дырэктара.

Таксама было зададзена пытанне: **«Ці згодны вы з тым, што адной з найважнейшых падзей у гісторыі нашай краіны з'яўляецца Вялікая Айчынная вайна?**

«Згодны» — так адказалі 90,5 % апытаных. «Не згодзен» — 5 %. Не змаглі адказаць — 4,5 % рэспандэнтаў.

«Насуперак неаднаразовым спробам падвергнуць рэвізіі гісторыю краіны цэнтральнае месца ў гістарычнай памяці беларусаў займае Вялікая Айчынная вайна, падзеі якой выклікаюць найбольшую цікавасць. Найважнейшымі падзеямі, звязанымі з Вялікай Айчыннай вайной, у гістарычнай памяці грамадства выступаюць перамога, вызваленне і супраціўленне (у гады вайны). І дзесяцігоддзямі народная памяць аб тых радасных і трагічных падзеях аб'ядноўвае ўсіх беларусаў незалежна ад канфесіі, месца пражывання, узросту, — адзначыў Мікалай Сухоцкі. — Гэта гераічны подзвіг і цяжкія выпрабаванні народа ў перыяд, які будзе заставацца яшчэ доўгія гады адным з найбольш важных у гісторыі Беларусі. А дзень Перамогі будзе заўсёды асабліва значны для большасці грамадзян, застаючыся галоўным усенародным святам краіны».

Паводле БелТА.

НОВЫЯ СТАРОНКІ ПАМЯЦІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

Вялікая Айчынная вайна займае асаблівае месца ў гістарычнай памяці народа. Напярэдадні Дня Перамогі ў Доме прэсы прэзентавалі выданні, прысвечаныя тэме генацыду. Прадстаўнікі выдавецтва «Беларусь» і аўтары прэзентаваных выданняў абмеркавалі пытанні: што робіцца ў сучаснай Беларусі для ўвекавечвання ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, якія меры прымаюцца, каб абараніць усеагульную Перамогу ад спроб фальсіфікацыі і многае іншае.

— Выпуск кніг пра Вялікую Айчынную вайну, гісторыю Беларусі — заўсёды ў прыярытэце ў нашага выдавецтва. Апошнія два гады запыт у чытачоў на кнігі, якія асвятляюць гэту тэму, вырас у разы. Тыраж кнігі ў нас у сярэднім 1,5—2 тысячы экзэмпляраў, і калі раней ён рэалізоўваўся год-два, то цяпер тыражы кніг, якія ўзнімаюць гэтую тэму, разыходзяцца за некалькі месяцаў, — распавядае **загадчык аддзела рэкламы выдавецтва «Беларусь» Анжэла САДОЎСКАЯ.** — Напрыклад, калі казаць пра кнігу «Хатынь», якая выйшла напрыканцы лютага, то мы ўжо паставілі пытанне пра яе перавыданне. А значыць, запыт на гэтую літаратуру сёння вялікі, прычым гэта датычыцца не толькі замоў публічных бібліятэк, але і ў цэлым кніжнага гандлю, што зразумела, бо, ведаючы гісторыю, працэй разабрацца ў падзеях, якія адбываюцца сёння. А другая прычына — усе нашы кнігі, па сутнасці, — адзін вялікі дакумент, дзе змешчана вывераная інфармацыя. Гэтыя кнігі адкрываюць вочы на многія рэчы, захоўваюць нашу гістарычную праўду.

Сёння ў выдавецтве рыхтуюцца да выхаду яшчэ некалькі рукапісаў, якія ў найбліжэйшы час таксама папоўняць шэраг кніжных крыніц пра Вялікую Айчынную вайну. І кнігі гэтыя разлічаны на розную аўдыторыю. Выдаўцы клапоцяцца, каб яны былі даступныя не толькі беларусам, але і гасцям нашай краіны. Выданні прадстаўлены, напрыклад, у сувенірнай краме Мірскага замка і ў іншых месцах, каб у максімальна вялікай аўдыторыі з'явілася магчымасць даведацца праўду пра падзеі той вайны.

— Адна з навінак нашага выдавецтва — гэта кніга «Свяшчэнная памяць Вялікай Перамогі», галоўны пасыл якой у тым, што не існуе больш ці менш знакавых помнікаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Кожны аднолькава важны, і наша галоўная задача сёння — захаваць памяць пра іх. Гэта і робіцца з боку дзяржавы, калі рэстаўрыруюцца мемарыяльныя комплексы, вядзецца даследчыцкая работа, — адзначае **загадчык рэдакцыі па выпуску навукова-папулярнай і даведачнай літаратуры выдавецтва «Беларусь» Вольга ДАВІДОВІЧ.**

Акрамя гэтага, упершыню прэзентавалі зборнік дакументаў і матэрыялаў аб злачынствах нацыстаў і іх памагатых, якія былі здзейснены на тэрыторыі Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Усё гэта сабралі ў кнігу «Без тэрміну даўнасці». У ёй можна знайсці інфармацыю пра палітыку нацыстаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі, пра пасляваенныя расследаванні злачынстваў. Усяго такіх зборнікаў шэсць, па кожнай вобласці нашай краіны. Прэзентаваны зборнік мае чатыры дадаткі, адкуль можна даведацца пра месцы прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыі вобласці, спіс месцаў масавага знішчэння яўрэяў, а таксама спіс буйных карніцкіх аперацый і звесткі пра сельскія населеныя пункты, якія былі знішчаны нацыстамі поўнасцю або часткова з насельніцтвам ці без яго.

Асаблівай увагі вартае і выданне «Шталаг № 354». Яно прысвечана стацыянарнаму лагеру для савецкіх ваеннапалонных. Кніга з'явілася ў выніку сумесна прынятага рашэння Наваполацкага гарадскога выканаўчага камітэта і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ефрасінні Полацкай аб тым, што наспела неабходнасць стварэння навукова-папулярнага выдання, прысвечанага «Шталагу 354», які дзейнічаў на тэрыторыі ваеннага гарадка ў перыяд з 1941 да 1943 года.

— Праца па напісанні кнігі вялася даволі хутка, але матэрыял для яе мы з калегам па крупінках збіралі на працягу 10—15 гадоў. Скажу шчыра, што гэта не было для нас самамэтай першапачаткова, таму што кірунак маёй навуковай дзейнасці крыху іншы. Плюс цяжкасць заключалася ў тым, што няма прамых дакументаў. Але галоўнай мэтай было паказаць не толькі гісторыю стварэння і функцыянавання лагера для ваеннапалонных, але і трагедыю чалавека на вайне. Не менш важнай мэтай было наша жаданне персаналізаваць, паказаць лёсы людзей, загінулых на тэрыторыі «Шталага 354», — згадвае **кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Е. Полацкай, аўтар кнігі Алеся КОРСАК.** — У кнізе мы асаблівую ўвагу ўдзяляем гісторыям медыцынскага персаналу, паказваем стратэгіі выжывання і супраціўлення палонных. На мой погляд, упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі мы ўзнімаем праблему жанчын-ваеннапалонных у гэтым лагеры... І праца па ўвекавечванні памяці намі працягваецца.

Алена ДРАПКО.
Фота дадзена Домам прэсы.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 5 мая.
Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.17	20.56	15.39
Віцебск —	5.01	20.52	15.51
Магілёў —	5.07	20.47	15.40
Гомель —	5.10	20.37	15.27
Гродна —	5.33	21.11	15.38
Брэст —	5.40	21.05	15.25

Імяніны

Пр. *Анастасіі, Івана. Мікалая, Паўла, Пятра, Сцяпана, Сямёна, Сяргея.*
К. *Антаніны, Антона, Яна.*

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

10 МАСТА

У краіне

1883 год — нарадзіўся Янка Маўр (сапр. Іван Міхайлавіч Фёдараў), беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1920-я працаваў у Наркамаце асветы Беларусі, у рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972).

1903 год — нарадзіўся Марк Міхайлавіч Моін, беларускі акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі.

1918 год — таварыства беларускай драмы і камедыі рэарганізавана ў Беларускі дзяржаўны тэатр.

У гэты ж год нарадзіўся Іван Дзянісавіч Прахарэнка, беларускі вучоны, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі.

1923 год — нарадзіўся Джумаш Асаналіеў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944).

У гэты ж год нарадзіўся Віктар Фёдаравіч Трыхманенка, беларускі пісьменнік. Быў ваенным лётчыкам, пасля працаваў журналістам.

1928 год — нарадзіўся Уладзімір Паўлавіч Самсонаў, беларускі вучоны ў галіне аграбіялогіі, акадэмік НАН Беларусі, Акадэміі аграрных навук Беларусі (1992—2002), член-карэспандэнт Расійскай акадэміі сельскагаспадарчых навук (1991), доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі.

1938 год — нарадзіўся Іван Іванавіч Кананоўіч, беларускі пісьменнік.

У свеце

1503 год — мараплавец Хрыстафор Калумб адкрыў Кайманавы астравы.

1788 год — нарадзіўся Жан Агюстэн Фрэнэль, французскі фізік, адзін з заснавальнікаў хвалевай оптыкі.

1923 — нарадзіўся Гейдар Аліевіч Аліеў, савецкі і азербайджанскі дзяржаўны і партыйны дзеяч. Прэзідэнт Азербайджана з 1993 да 2003 года. Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы (1979, 1983).

1933 — у Берліне на плошчы перад будынкам Дзяржаўнай оперы нацысты спалілі на вогнішчы звыш 12 тысяч кніг сусветна вядомых мысліцеляў і пісьменнікаў, якія аказаліся пад забаронай у фашысцкай Германіі.

1938 год — нарадзілася Марына Уладзі (Палякова-Байдарава), французская актрыса тэатра і кіно. Аўтар кнігі пра Уладзіміра Высоцкага «Уладзімір, або Перарваны палёт».

Так гаварыў...

ЛЕЎ ТАЛСТОЙ:

«Сапраўдная сіла чалавека не ў памкненнях, а ў непарушным спакоі».

УСМІХНЕМСЯ

— Якая твая любімая шакаладка?
— Шашлык!

Хачу настолькі аддаленую работу, каб наогул яе не бачыць!

Парада: калі вам тэлефануюць, кажыце, што тэлефон разраджаецца.

Гэта дапаможа галоўнае даведацца адразу.

— Калі пачынаецца старасць?
— Калі касметычка ператвараецца ў аптэчку.

Табе можа быць колькі заўгодна гадоў, але раніцай ты выглядаеш на ўсе 100.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.441. Індэкс 63850. Зак. № 1181.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 мая 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12